ДА 280-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ І. КАНТА

**УДК 14(091 )(430)**

# ГНАСЕАЛАГІЧНЫ ЗМЕСТ ІДЭІ ТРАНСЦЭНДЭНТАЛІЗМУ Ў ФІЛАСОФІІ І. КАНТА

***канд. філас. навук, дац. Р.Д. ГРУДНІЦКІ***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Даследуецца ідэя трансцэндэнталізму як спосаб абгрунтавання актыўнай прыроды суб'екта пазнання ў філасофіі І. Канта.*

*У* працэсе філасофскіх даследаванняў 40 - 60-х гадоў XVIII стагоддзя Кант выявіў два фактары, якія істотна паўплывалі на яго далейшае равіццё. Гэта культура як мэта чалавека і вынік яго актыўнай мэтанакіраванай дзейнасці, у якой ён ажыццяўляе сваю маральную свабоду, і вопыт як сфера, што абмяжоўвае дзейнасць пазнавальных здольнасцей чалавека.

Апошняя акалічнасць на першы погляд здаецца трывіяльнай, бо гнасеалагічны аналіз вопыту ў большай альбо меншай ступені ўласцівы ўсёй новаеўрапейскай філасофіі. Аднак гэта толькі здаецца. Пад час аналізу сучаснага яму прыродазнаўства Кант заўважыў штосьці большае, чым яго папярэднікі і сучаснікі. Апошнія арыентацыю на вопыт лічылі недахопам прыродазнаўства, які пазбаўляе яго навуковасці, бо вопыт як чыста перцэптыўная дзейнасць, што завяршаецца індукцыйным абагульненнем пачуццёвага матэрыялу, можа даць толькі аналітычныя веды, пазбаўленыя ападыктычнасці.

Кант жа, насуперак сваім папярэднікам, выявіў усю прынцыповасць гэтай арыентацыі, яе неабходнасць. З гэтага пункту гледжання вопытная арыентацыя ёсць прыкмета навуковасці, а зарыентаванае на вопыт прыродазнаўства і ёсць навукай у дакладным сэнсе гэтага слова. Для абгрунтавання гэтага папажэння неабходна было звярнуцца да ўсебаковага аналізу вопыту. І з самага пачатку Кант рашуча адмаўляецца ад трактоўкі вопыту ў катэгорыях традыцыйнай філасофіі. У Канта, вопыт - гэта менавіта пазнавальны вопыт, навуковы эксперымент. Гэта - штучна створаная пазнавальная сітуацыя, мэта якой - пазнанне прыродных працэсаў. І задача Канта- выявіць прынцыпы будовы гэтай сітуацыі альбо, словамі самога Канта, умовы магчымасці вопыту як сферы канструявання аб'екта пазнання.

Беручыся за рашэнне гэтай задачы, Кант пагаджаецца з тэзісам папярэдняй філасофіі аб вопытным паходжанні ведаў. З гледзішча гэтай філасофіі, каб абгрунтаваць магчымасць і растлумачыць прыроду навуковых ведаў, неабходна звярнуцца да вопыту, бо веды носяць вопытны характар і таму з'яўляюцца яго тэарэтычным зместам. Таму, каб растлумачыць умовы магчымасці вопыта, неабходна ажыццявіць яго анапіз. Цалкам відавочна, што, па-першае, рашэнне праблемы пазнання ажыццяўляецца на тым жа ўзроўні, на якім яна ўзнікае менавіта як праблема. Па-другое, абгрунтаванне магчымасці ведаў спрабуюць адшукаць у тым, што само патрабуе абгрунтавання. Адкрыццё гэтай фундаментальнай супярэчнасці прыводзіць Канта да высновы: менавіта з нагоды вопытнага паходжання ведаў выявіць умовы іх магчымасці ў межах наяўнага вопыту нельга. Для гэтага неабходна выйсці за межы вопыту, заняць трансцэндэнтальную пазіцыю.

Ідэю трансцэндэнталізму нельга ўяўляць проста як традыцыйную спробу распрацаваць метадалагічныя рэкамендацыі, якія, з аднаго боку, папярэднічаюць, а з другога - робяць магчымым стварэнне новай філасофіі. Ідэя трансцэндэнталізму - гэта новая пастаноўка праблемы пазнання. Аб гэтым сведчыць ужо сама задумка стварэння фіасофіі як крытыкі розуму. Крытыкі, якая, на думку Канта, з'яўляецца не аперацыйнай асновай пазнання, не прадмовай да яго, а самім пазнаннем як тэарэтычна канструктыўным мысленнем, што стварае асновы новай сістэмы.

Сістэма адрозніваецца ад крытыкі тым, што яна ёсць «поўным і завершаным выражэннем таго плана, які крытыка малюе «архітэктанічна», г. зн. заснаваны на прынцыпах поўны план з парукай за паўнату і надзейнасць усіх частак гэтага будынка» [1, с. 122]. У якасці метадалагічнай асновы крытыка ёсць «прапедэўтыкай чыстага розуму», але адначасова да яе належыць усё, «з чаго складаецца трансцэндэнтальная філасофія: яна ёсць поўная ідэя трансцэндэнтальнай філасофіі» [1, с. 123]. Таму крытыка - гэта сістэма ў зародку, якая імкнецца да развіцця. Сфера чыстага розуму агульная і для крытыкі, і для сістэмы, таму яна ўяўляе сабой новае бачанне сутнасці філасофіі і спосабу пастаноўкі праблемы пазнання.

Калі папярэдняя філасофія, разглядаючы суб'ект і аб'ект як незалежныя адзін ад аднаго члены пазнавальных адносін, пытаецца аб умовах іх узгодненасці, што прыдае ведам дастаравернасць, то Кант ставіць пытанне аб умовах нашага пазнання прадметаў, якія адначасова з'яўляюцца і ўмовамі існавання

гэтых прадметаў. Канта цікавіць не быццё і не пазнанне, яго цікавіць пытанне аб іх адзінстве, іх агульнай аснове. На думку Канта, адзінства суб'екта і аб'екта ў пазнавальных адносінах з'яўляецца спосабам бачання рэальных прадметаў і, да таго ж, такім спосабам, па-за якім бачыць і разумець рэальныя прадметы мы не можам. Вось чаму падставы пазнання, на думку Канта, неабходна шукаць у цэласнай структуры эмпірычна-чалавечага свету, аб'ектыўнасць якога заўжды дадзена разам з яго пачуццёва-паняційнай схематызацыяй, якая ёсць вынікам актыўнасці пазнаючага мыслення. Таму тэорыя пазнання ў кантаўскай крытычнай трактоўцы паўстае як уласна філасофія і адрозніваецца ад тэорыі пазнання ў папярэдняй філасофіі, дзе яна падпарадкавана больш шырокай і першаснай анталагічнай праблематыцы. У выніку і само пазнанне, і спосабы яго абгрунтавання, і разуменне яго сувязі з аб'ектам паўстаюць у іншай і прынцыпова новай перспектыве, сутнасць якой адлюстравана ў ідэі трансцэндэнталізму.

На чым заснавана гэтая ідэя? Звяртаючы ўвагу на прадмет трансцэндэнтальнай філасофіі, Кант піша: «Я называю трансцэндэнтальным усякае пазнанне, скіраванае не столькі на прадметы, колькі на віды нашага пазнання прадметаў, паколькі гэтае пазнанне павінна быць магчымым apriori» [1, с. 121]. Сэнс гэтага азначэння мае двайную скіраванасць. Па-першае, яно супрацьпастаўляе крытычную трактоўку пазнання традыцыйна-філасофскай інтэрпрэтацыі яго як у эмпірычнай, так і метафізічна-рацыяналістычнай форме. Гэта значыць, яно скіравана як супраць эмпірызма з яго прынцыповай апастэрыёрнасцю, гэтак і супраць дагматычнага рацыяналізму з яго фальшывай трансцэндэнтальнасцю. Але гэта толькі адзін і не самы галоўны аспект. Больш значным з'яўляецца тое, што трансцэндэнтальная пазіцыя мяняе разуменне самой прыроды пазнання. Эмпірычным пазнанне з'яўляецца не таму, што яно апастэрыёрнае, г. зн. паходзіць з вопыту, а таму што апрыёрныя формы яго магчымасці прымяняюцца толькі да прадметаў вопыту. Метафізічным жа пазнанне з'яўляецца не таму, што абапіраючыся на «першыя асновы», вядзе розум ва ўяўную сферу адзінага, усеагульнага, існага. Метафізічным яно ёсць таму, што імкнецца да пазнання прадмета самога па сабе і пры гэтым цалкам абстрагуецца ад спосабаў і ўмоў яго дадзенасці суб'екту.

Трансцэндэнтальнае пазнанне адрозніваецца ад эмпірычнага тым, што яно ўпершыню выяўляе яго апрыёрны характар і даследуе ўмовы ўзгодненасці апрыёрных форм з прадметнай рэчаіснасцю. «Трансцэндэнтальнымі... належыць называць не ўсякія апрыёрныя веды, а толькі тыя, дзякуючы якім мы даведваемся, што тыя альбо іншыя ўяўленні (сузіранні альбо паняцці) прымяняюцца і могуць існаваць выключна apriori, а таксама як гэта магчыма... Адрозненне паміж трансцэндэнтальным і эмпірычным звязана толькі з крытыкай ведаў і не мае дачынення да адносінаў іх да прадмета» [1, с. 158]. Ад метафізічнага ж пазнання яно адрозніваецца тым, што пытаецца не аб прадметным змесце паняццяў, а аб іх канструктыўнай функцыі. Гэта значыць, трансцэндэнтальнае пазнанне высвятляе, як апрыёрныя формы чалавечай суб'ектыўнасці адначасова з'яўляюцца і формамі магчымай рэальнасці і аб'ектыўна-змястоўных ведаў.

Такім чынам, трансцэндэнталізм як гнасеалагічная пазіцыя супрацьстаіць тэарэтыка-пазнавальным канструкцыям дакантаўскай філасофіі. Калі папярэдняя філасофія задаецца пытаннем аб тым, што такое пазнанне і што такое веды і пры гэтым зыходзіць з першапачатковай супрацьпастаўленасці суб'екта і аб'екта, то Кант ставіць пытанне аб магчымасці пазнання ў сувязі з умовамі і неабходнай струкгурай пазнання як гэткага.

Рашэнне гэтага пытання ажыццяўляецца ў напрамку развіцця ідэй, сфармуляваных у агульным выглядзе ў дысертацыі 1770 года. Ужо ў 60-я гады Кант заўважыў тую адметнасць пазнання, аб якой гаворка вялася вышэй, а менавіта: прынцыповую дадзенасць прадмета суб'екта ў працэсе пазнання. Гэтая дадзенасць праяўляецца ў любым акце пазнання і па-за ёю наяўнасць таго, што падлягае пазнанню, немагчыма. Калі абстрагавацца ад усіх спецыфічных адметнасцей гэтай дадзенасці, то застаецца адно: пазнанне ёсць функцыяй адносін паміж тым, хто пазнае, і тым, што падлягае пазнанню. Пры адсутнасці аднаго з элементаў распадаюцца ўсе адносіны. Гэта азначае, што пазнанне магчыма толькі ў гэтых адносінах, якія таму павінны разглядацца як цэласнасць. Такім чынам, пазнавальныя адносіны набываюць у Канта характар сістэмы, а пазнанне паўстае як функцыя гэтай сістэмы. Яго формы і змест не могуць быць вызначаны ні суб'ектам, ні аб'ектам, ні простым адлюстраваннем аб'екта ў суб'ектыўным успрыняцці. У гэтым і заключаецца сапраўдны і больш глыбокі сэнс ідэі трансцэндэнталізму. Трансцэндэнталізм як гнасеалагічная пазіцыя, якая ставіць пытанне аб магчымасці пазнання, дазваляе ўпершыню выявіць цэласную структуру пазнавальных адносін. Гэтым самым ён дазваляе зусім інакш уявіць асобныя члены гэтых адносін, бо вызначае іх статус у межах структурнай цэласнасці. Абодва члены пазнавальных адносін аказваюцца ўзаемазвязанымі і ўзаемазалежнымі таму, што яны ёсць элементамі гэтай цэласнасці. Уласныя асновы функцыянавання пазнавальных адносін як сістэмы адначасова з'яўляюцца апрыёрнымі ўмовамі магчымасці асобных элементаў гэтых адносін, асновай іх узаемаўзгодненнасці.

Да Канта гаворка ішла альбо аб тым, «як» розум пазнае, і тады аказвалася, што, адарваны ад прадметнай рэальнасці, ён здабывае веды, якія не маюць прадметнага зместу. Ці гаворка ішла аб тым, «што» розум пазнае, але тады недасягальнымі заставаліся падставы яго пазнавальнай здольнасці. Кант у «Крытыцы чыстага розуму» злучыў гэтыя пытанні і ажыццявіў спробу выявіць механізм («як») пазнання ў сувязі са сферай («што») яго паўнамоцтваў.

Папярэдняя філасофія, аналізуючы праблему пазнання, засяроджвала сваю ўвагу альбо на субстанцыялізаваным мысленні, уключаным у сферу інтэлігібельнага па сутнасці сваёй быцця, альбо на суб'екце, у індывідуальных перажываннях якога раствараецца аб'ектыўна-рэальны характар прадметнага свету. І ў адным, і ў другім выпадку страчваецца сувязь суб'екта з аб'ектам, умовы іх узгодненнасці, якія забяспечваюць верагоднасць ведаў, растлумачыць немагчыма. Самі пазнавальныя адносіны набываюць «усечаную» форму, бо аказваюцца зведзенымі да аднаго з членаў. Таму магчымасць пазнання тлумачыцца з дапамогай тэзісаў аб «прыроджаных ідэях», «прэстабільнай гармоніі», альбо такая магчымасць выключаецца наогул.

Кант жа падыходзіць да аналізу пазнавальных адносін з пункту гледжання іх структурнай цэласнасці і выяўляе пастаянна зададзеную ўзаемасувязь іх членаў. У такіх адносінах статус суб'екта і аб'екта набывае адносны характар. Ні адзін, ні другі не ахоплівае той цэласнасці, у межах якой яны абодва функцыянуюць і за межамі якой ніводзін з іх немагчымы. У гэтым праяўляецца іх другаснасць адносна форм сувязі, якая забяспечвае адзінства суб'екта і аб'екта. Аб'ектыўнасць прадмета як аб'екта пазнання ў гэтых адносінах заўжды паўстае злучанай з унутранай структурай суб'екта, зарыентаванага на дадзены аб'ект. Таму абодва члены пазнавальных адносін, якія ў дакантаўскай філасофіі ізаляваны праз першапачатковую адрозненасць і супрацьпастаўленасць адзін аднаму, у тэорыі пазнання Канта ўтвараюць адзінства і ўзаемасувязь. Кожны з іх можа быць вызначаны толькі праз другога, бо абодва яны існуюць толькі ў гэтых узаемных адносінах. Таму аб'ект як аб'ект пазнання ніколі не выступае сам па сабе, а толькі ў яго сувязі з суб'ектам. Па-за гэтай сувяззю яго нельга нават памысліць.

Вось чаму з пункту гледжання пазнання «тое, што зусім не знаходзіцца ў аб'екце самім па сабе, а заўжды сустракаецца ў яго адносінах да суб'екта і неатдзельнае ад уяўлення аб ім» ёсць з'явай [1, с. 151]. Прадмет, уцягнуты ў пазнавальныя адносіны, ужо не выступае ў сваім прыродным быцці, а нясе ў сабе элемент суб'ектыўнасці. Калі прыродны прадмет уключаецца ў пазнавальныя адносіны і становіцца аб'ектам пазнання, то ён выступае як працяг чалавечай суб'ектыўнасці і аказваецца вытворным ад суб'екта. Гэта азначае, што ў пазнавальных адносінах аб'ект заўжды выступае як «суб'ектывізаваны» аб'ект, таму што ён ужо прысвоены суб'ектам і асэнсаваны ім. Гэта пераўтвораны суб'ектыўнай дзейнасцю аб'ект, уцягнуты ў сферу чалавечага вопыту. Яго аб'ектыўнасць у межах пазнавальных адносін мае адносны характар, таму яна з'яўляецца і магчымай тэарэтычнай аб'ектыўнасцю. Сукупнасць такіх тэарэтычных аб'ектаў Кант называе прыродай. Гэта ўпарадкаваная паводле законаў сфера магчымага вопыта як сфера дзейнасці чалавека.

З другога боку, суб'ект цалкам уцягнуты ў гэтую цэласную структуру пазнавальных адносін і фундаментальна ёю вызначаны. Эмпірычна-тэарэтычная суб'ектыўнасць яго залежыць ад існавання аб'екта і, значыць, магчыма толькі дзякуючы таму, што аб'ект будзіць здольнасць уяўлення. Таму суб'ект таксама (і ў роўнай ступені) вытворны ад аб'екта. Гэтая адносная прырода суб'екта робіць яго «аб'ектывізаваным». Такі суб'ект ніколі не існуе па-за адносінамі да таго, што не ёсць ім самім, што дадзена і абуджае яго здольнасць уяўлення. Ён заўжды скіраваны на нейкі прадмет. Суб'ектыўнасць з гэтага пункту гледжання можна зразумець як сувязь, якая забяспечвае цэласнасць пазнавальных адносін.

Такім чынам, і суб'ект, і аб'ект толькі разам утвараюць два ўзаемазвязаныя бакі той цэласнасці, якая называецца пазнавальнымі адносінамі і ў якой толькі і магчыма пазнанне. Аднак дадзенасць аб'екта суб'екту нельга разумець у традыцыйна-філасофскім сэнсе, бо гэта вядзе да інтэлектуальнага сузірання, якое непасрэдна пранікае ў сутнасць дадзенага. Кант ужо ў дакрытычны перыяд адмовіўся ад ідэі інтэлектуальнай інтуіцыі, бо бачыў у ёй крыніцу бязмежнай спекуляцыі. Дадзенасць прадмета разумеецца Кантам толькі як зададзенасць невызначанасці. Прадмет зададзены суб'екту праз органы пачуццяў, але гэтая дадзенасць характарызуецца фрагментарнасцю і выпадковасцю. Вобраз прадмета, які ўзнікае ў полі знешніх пачуццяў, настолькі невызначаны, што яго дадзенасці недастаткова нават для таго, каб сцвярджаць, што гэта прадмет. Таму дадзенасць у кантаўскай інтэрпрэтацыі неабходна разумець як невызначанасць перадстаяння чагосьці суб'екту. Гэта толькі зададзенае нешта, якое, з аднаго боку, сведчыць аб наяўнасці аб'екта, а з другога - магчыма толькі дзякуючы прысутнасці суб'екта. Пераўтварэнне гэтай невызначанасці ў гнасеалагічна вызначаны прадмет ажыццяўляецца суб'ектам. Менавіта суб'ект уносіць у гэтую зададзеную фрагментарнасць адзінства і сувязь і гэтым ператварае яе ў вобраз цэласнага прадмета.

Такая інтэрпрэтацыя дадзенасці мае для філасофіі Канта прынцыповае значэнне. Па-першае, яна прыводзіць яго да ідэі, змест якой павінен быць так альбо інакш засвоены ў якасці зыходнай тэарэтычнай перадумовы метадалагічнага даследавання. Гаворка ідзе аб адкрытых Кантам суб'ектыўных перадумовах аб'ектыўнасці ведаў. Па-другое ж, і гэта самае важнае, ад гэтай інтэрпрэтацыі Кант з неабходнасцю прыходзіць да ідэі актыўнай прыроды суб'екта пазнання.

Вышэй ужо адзначалася, што аб'яднанне фрагментарнай дадзенасці ажыццяўляецца суб'ектам. Гэта азначае, што суб'ект не проста пасіўна ўспрымае знешнюю дадзенасць, якая абуджае яго па-чуццёвасць, а актыўна ўключаецца ў перапрацоўку яе. Бліжэйшай мэтай гэтай перапрацоўкі з'яўляецца злучэнне дадзенага і невызначанага матэрыялу ў адзіны вобраз. Але «сярод усіх уяўленняў сувязь - адзінае, што не даецца аб'ектам, а можа быць створана толькі самім суб'ектам, бо яна ёсць актам яго самадзейнасці» [1, с. 190].

Сувязь прыўносіцца ў аб'ект суб'ектам, але гэта не азначае, што яна ёсць вынікам суб'ектыўнай адвольнасці. Калі б гэта было так, то Кант нс выйшаў бы за межы юмаўскай гнасеалогіі, якую ён лічыў «скандалам філасофіі». Гэтая сувязь ажыццяўляецца суб'ектам, апе пры пэўных умовах, паводле пэўных правіл. А гэтыя ўмовы нельга знайсці не толькі ў аб'ектце, які, каб стаць аб'ектам, ужо павінен быць звязаны. Але іх нельга знайсці і ў суб'екце, бо непасрэдна дадзеная разнастайнасць заўжды ўяўляецца суб'ектам як ужо ўнутрана звязаная. Гэтыя ўмовы могуць быць выяўленыя толькі ў пазнавальных адносінах як цэласнай сістэме. Таму яны трансцэндэнтальны членам гэтых адносінаў, г. зн. ляжаць за межамі эмпірычнага суб'екта, за межамі індывідуальнага вопыта, па-за дадзеным у вопыце аб'ектам. Гэтыя ўмовы ёсць вынікам трансцэндэнтальнага адзінства аперцэпцыі як уяўлення ***«Я*** мыслю», якое з неабходнасцю аб'ядноўвае ўсе іншыя ўяўленні як уяўленні адной свядомасці. Але гэта зусім не со<sup>л</sup>йо Дэкарта, зразумелае як абсалютнае і нічым не абумоўленае мысленне Кантаўскае «Я мыслю» трэба разумець толькі як «я мыслю нешта». Гэтым устанаўліваецца забарона на суб'ектыўную адвольнасць. Трансцэндэнтальнае адзінства самасвядомасці не стварае змест аб'екта, яно - толькі рэгулятыўны прынцып, фармальная ўмова, без якой дадзеная разнастайнасць уяўленняў не можа быць успрынята як прыналежная маёй свядомасці. Толькі ў гэтым сэнсе трансцэндэнтальная аперцэпцыя з'яўляецца ўмовай сувязі. Але сама па сабе яна не стварае гэтую сувязь і, значыць, не з'яўляецца дзейнасцю. Дзейнасць як ажыццяўленне сувязі забяспечваецца «спантаннасцю мыслення», сляпой, хоць і неабходнай функцыяй душы - прадуктыўнай здольнасцю ўяўлення» [1, с. 173]. Але гэта - прадмет новага даследавання.

## ЛІТАРАТУРА

1. Кант И. Критика чистого разума // Кант 14. Сочинения: В 6-ти т. - М.: Мысль, 1964. Т. 3. - 799 с.